УДК 94(4)»17»:63(091)

# АГУЛЬНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ РАЗВІЦЦЯ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ Ў ЕЎРАПЕЙСКІХ ДЗЯРЖАВАХ XVIII ст.

**Клімуць Л. Я.**
Установа адукацыі “Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова”
(г. Магілёў, Рэспубліка Беларусь)

Анатацыя. У артыкуле разглядаюцца асноўныя тэндэнцыі ў развіцці сельскай гаспадаркі ў Еўропе ў XVIII стагоддзі, калі яна была вызначальным сектарам эканомікі. Аналізуюцца асноўныя праблемы гэтага перыяду. Аўтар акцэнтуе ўвагу на рэформах у сельскай гаспадарцы, укараненні новых культур і метадаў, важнасці ўрадавай падтрымкі сельскагаспадарчай дзейнасці.

Ключавыя словы: сельская гаспадарка, XVIII стагоддзе, прадукцыйнасць, рэформы.

Summary. The article examines the main trends in the development of agriculture in Europe in the 18th century, when it was a defining sector of the economy. The main problems of this period are analyzed. The author focuses on reforms in agriculture, the introduction of new crops and methods, and the importance of government support for agricultural activities.

Key words: agriculture, 18th century, productivity, reforms.

Сельская гаспадарка была асноўнай крыніцай багацця і самым значным сектарам эканомікі ў XVIII ст. Таксама яна была асновай падаткаабкладання. У 1789 г. 74% працаздольнага насельніцтва Віварэ ў Францыі было занята ў сельскай гаспадарцы [5].

Уплыў сельскай гаспадаркі не абмяжоўваўся толькі сельскімі раёнамі. У XVIII ст. яшчэ не было яснага падзелу на гарадскую і сельскую гаспадарку. Так, у Фландрыі многія з тых, хто працаваў у сельскай прамысловасці, мелі сваю зямлю, на якой самі і працавалі. Таксама ў адной сям’і нехта мог пра-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

вытворчасці. Новыя землі маглі быць натуральна ўрадлівымі (Украіна), ці захаваць урадлівасць для вырошчвання збожжавых, паколькі там у асноўным да гэтага развівалася жывёлагадоўля (Цэнтральная Венгерская раўніна).

Не ўсе планы былі паспяховымі, але галоўны вынік быў у тым, што заўважна павялічыліся плошчы, аддадзеныя пад вырошчванне збожжавых. З'яўляюцца новыя зоны экспарту збожжа ў межах Еўропы.

Адным з вынікаў можна назваць дэмаграфічныя змены XVIII ст., а менавіта перамяшчэнне вялікай колькасці людзей у аўстрыйскую зону каланізацыі. Людзі перасяляліся на новыя землі, адкрытыя для апрацоўкі, каб павысіць свой дабрабыт ці нават выратавацца ад галечы. Але трэба адзначыць, што на Балканах міграцыя насельніцтва была таксама звязана з ваеннымі дзеяннямі, таму што людзі – гэта рэсурс, які нельга пакідаць ворагу.

Вялікая колькасць мігрантаў на новыя землі прыбывала з Цэнтральнай і Заходняй Еўропы. Тут назіраецца тэндэнцыя перамяшчацца па кантыненту ў пошуках аграрных магчымасцяў.

Для некаторай часткі людзей новыя землі знаходзіліся ў Амерыцы, асабліва ў брытанскіх калоніях, таму што ў іх было менш абмежаванняў на іміграцыю, а прырода і клімат некаторых тэрыторый мала адрозніваліся ад Еўропы. Так у будучых ЗША з'явіліся цэлыя рэгіёны нямецкага насельніцтва. Таксама немцы перасяляліся ў Венгрыю, Расію і Галіцыю, якая адышла да Аўстрыі пасля раздзелаў Рэчы Паспалітай [3].

Галоўным было сабраць дастатковую колькасць насельніцтва на новых землях, таму ўрады краін падтрымлівалі іміграцыю і ўводзілі розныя спрыяльныя законы. У сваю чаргу тыя ўрады, якія не хацелі згубіць сваё насельніцтва, маглі забараніць эміграцыю сялянства, як гэта было ў Даніі ў 1753 г.

Не заўсёды міграцыя ва Ўсходнюю Еўропу была паспяховай. Расчараваныя мігранты вярталіся дадому, не знайшоўшы на новых тэрыторыях земляў казачных магчымасцяў і той падтрымкі, на якую яны разлічвалі.

Падрабязнай і ўсебаковай статыстыкі сельскагаспадарчай вытворчасці па XVIII ст. няма, таму цяжка меркаваць, з чым у большай ступені было звязана павелічэнне вытворчасці – з пашырэннем плошчы зямель пад апрацоўкай ці паляпшэннем тэхналогій. У любым выпадку пашырэнне плошчы зямель пад апрацоўку было працаёмкім працэсам.

Унутраная каланізацыя ў еўрапейскіх краінах мела дзяржаўную падтрымку. Уводзіліся розныя фінансавыя стымулы, каб заахвоціць насельніцтва апрацоўваць большыя плошчы. Трэба сказаць, што ўвогуле ў той час да людзей, якія пражывалі на пустых землях і не апрацоўвалі іх, ставіліся падазрона. Так што жаданне распрацоўваць новыя землі было натуральным для сялян.

Тым не менш у сельскай гаспадарцы адбываюцца якасныя змены. Землеўладальнікі стваралі ўзорныя фермы. Так, саксонец І. Х. Шубарт перанёс бурак і бульбу на паравое поле, культываваў люцэрну і спаржу, рабіў доследы з канюшынай [7].

Практычныя парады можна было прачытаць у сельскагаспадарчай літаратуры. Калі ў 1700 г. выданняў па сельскай гаспадарцы ў Рэчы Паспалітай не існавала, то пасля 1750 г. іх з'явілася каля 300 [4]. Нямецкі пераклад кнігі Джона Гедзі «Англійскі пчальнік» (1675) быў апублікаваны ў Лейпцыгу ў 1727 г., і з яго быў зроблены венгерскі пераклад у 1759 г [2].

Таксама ўзнікалі сельскагаспадарчыя таварыствы. Яны распаўсюджвалі інфармацыю пра такія навінкі, як бульба. Паляпшэнне сельскай гаспадаркі стала моднай справай сярод брытанскіх землеўладальнікаў, якія часта ганарыліся тым, што іх малявалі разам з вялізнымі быкамі і іншымі прыкметамі аграрнага прагрэсу.

Урады дзяржаў таксама былі зацікаўленыя ў развіцці сельскай гаспадаркі. Прыклады фінансавай дапамогі мы знаходзім у нямецкіх княствах, падтрымку вырошчвання новых культур – у нямецкіх дзяржавах, Італіі і Швецыі. З новымі культурамі справы ішлі няпроста. У Францыі спецыялісты па паляпшэнні сельскай гаспадаркі пры падтрымцы ўрада імкнуліся ўкараніць рыс, аднак гэты крок быў сустрэты народным гневам, а ў Аверні – беспарадкамі, паколькі рыс лічыўся прычынай хвароб.

Аднак трэба адзначыць, што пытанне ступені ўплыву такіх прыхільнікаў новаўвядзенняў з'яўляецца спрэчным. На тых, хто прапагандаваў новае, заўсёды знаходзілася вялікая частка тых, хто сумняваўся ў неабходнасці такіх змен. Так, вядома, што пармскія законы аб зборы шаўковых коканаў і прадзенні шоўку і закон 1760 г. аб плантацыях шаўкоўніцы не выконваліся.

Тым не менш назіраліся якасныя і колькасныя змены ў сельскай гаспадарцы. Найбольш яўныя прыкметы колькаснага паляпшэння назіраюцца ў Англіі, Каталоніі і Нідэрландах. Назіраецца і некаторая спецыялізацыя: Каталонія выраблялa віно і брэндзі, Нідэрланды – садовыя і тэхнічныя культуры, такія як лён і каноплі.

Змены ў сельскай гаспадарцы звязаныя і з практыкай агароджванняў. Асабліва гэты працэс быў характэрны для Англіі. Агароджванні не абавязкова паляпшалі эфектыўнасць, але яны аблягчалі кантроль над зямлёй. Агароджванні парушалі традыцыйныя правы, пра што многа напісана ў гістарычнай літаратуры. Аднак, будучы працаёмкімі, а не капіталаёмістымі, такія працэсы, як агароджванне, таксама стваралі працоўную занятасць,таму што трэба было рамантаваць агароджы, капаць каналы, сачыць за агульным станам.

Значныя паляпшэнні назіраліся ў Галандыі. Цікавасць выклікала вырошчванне такой новай культуры, як тытунь, які нават распаўсюджваецца на жывёлагадоўчыя правінцыі (Фрысландыя).

Неабходна адзначыць, што і другія рэгіёны Еўропы развіваліся даволі значна. Так, у многіх краінах распаўсюджваецца вырошчванне бульбы, асабліва ў другой палове XVIII ст. Кукуруза была асабліва папулярнай на паўночным захадзе Францыі і на поўначы Італіі. Новыя культуры сведчаць пра тое, што існавала гатоўнасць мяняць звыклыя метады. Таксама гэта зменшыла мясцовую ўразлівасць перад хваробамі сельскагаспадарчых культур і кліматычнымі бедствамі. У Прусіі вырошчваюць кармавыя культуры, а таксама бульбу і тытунь. У Германіі ў цэлым асноўныя дасягненні рэфарматараў сельскай гаспадаркі прыйшліся на канец XVIII ст. У Ламбардыі павялічваецца вырошчванне рысу.

Паляпшэнні ў сельскай гаспадарцы не абавязкова павінны разглядацца як працэс, навязаны рэфарматарамі сялянам, якія ўсімі магчымасцямі супраціўляюцца. Ролю сялянскага прадпрымальніцтва ў павелічэнні вытворчасці прадуктаў харчавання ў Еўропе немагчыма вымераць колькасна, але яна была значнай. Рост насельніцтва адкрываў новыя магчымасці і рост попыту, чым і карысталіся самыя прадпрымальная сяляне.

Такім чынам, хоць сельскагаспадарчая вытворчасць яшчэ не магла цалкам вырашыць праблему недаядання ці вызваліць значную частку сельскагаспадарчай працоўнай сілы для працы ў прамысловасці і для міграцыі, павелічэнне плошчы апрацоўваемых зямель і распаўсюджванне новых культур і метадаў забяспечвала дастатковую колькасць харчавання, каб спрыяць росту насельніцтва і, такім чынам, падтрымліваць больш высокі ўзровень эканамічнай актыўнасці.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**


1. Black, J. Eighteenth-Century Europe / J. Black. – St. Martin's Press, Inc., 1999. – 594 p.
2. Bryden, D. J. John Gedde's Bee-House and the Royal Society / D. J. Bryden // Notes and Records of the Royal Society of London. – 1994. – Vol. 48, №. 2. – P. 193–213.
3. Fenske, H. International Migration: Germany in the Eighteenth Century / H. Fenske. – Central European History. – 1980. – Vol. 13, №. 4. – P. 332–347.
4. Liponski, W. British Patterns in Polish Agriculture of the early 19th century [Electronic resource] / W. Liponski. – Mode of access: https://repozytorium.amu.edu.pl/server/api/core/bitstreams/57a6f1b5-927f-4b81-89bc-019481df2a80/content. – Date of access: 04.02.2025.
5. Miller, S. J. The Economy of France in the Eighteenth and Nineteenth Centuries: Market Opportunity and Labour Productivity in Languedoc [Electronic resource] / S. J. Miller // Published online by Cambridge University Press: 01 April 2009. – Mode of access: https://www.cambridge.org/core/journals/rural-history/article/abs/economy-of-france-in-the-eighteenth-and-nineteenth-centuries-market-opportunity-and-labour-productivity-in-languedoc/ BBCB26172575BDB20D03BBA34E09EBBD. – Date of access: 03.02.2025.
6. Rutger, Jan Schimmelpenninck [Electronic resource]. – Mode of access: http://www.biografischportaal.nl/persoon/38999628. – Date of access: 03.02.2025.
7. Шубарт, Иоганн Христиан [Электронный ресурс] // Энцикл. словарь: [в 86 т.] / изд. : Ф. А. Брокгауз, И. А. Ефрон. – Режим доступа: https://www.booksite.ru/fulltext/1/001/007/117/117249.htm. – Дата доступа: 04.02.2025.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова